

Газета заснавана ў 1938 годзе. Адноўлена ў 1997 годзе.

МАСАВА-ПАЛІТЫЧНЫ ШТОТЫДНЁВІК

Газета Слонімская

№11 (353) 11 — 17 сакавіка 2004 г. Наклад 10.950 экз. Кошт у розніцу свабодны

«ГАЗЕТУ СЛОНІМСКУЮ» ЧЫТАЮЦЬ Слонім, Зэльва, Дзятлава, Масты, Ваўкавыск, Шчучын, Ліда, Гродна, Баранавічы, іншыя гарады Беларусі, а таксама на HTTP://gs.promedia.by

КРИМИНАЛ

НАЧАЛЬНИК «КИНУЛ» ГОСУДАРСТВО ПОЧТИ НА 36 МИЛЛИОНОВ РУБЛЕЙ

Уголовное дело по обвинению бывшего начальника управления финансовых расследований КГК по Гродненской области Александра Ларионова в злоупотреблении служебными полномочиями передано в суд.

По мнению следствия, вина Ларионова состоит в том, что он необоснованно освободил от санкций российское ООО «Линдерс», давальца Слонимской камвольно-прядильной фабрики, разрешив до того приостановленную отгрузку россиянам продукции белорусской фабрики.

Проверку Слонимской камвольно-прядильной фабрики управление финансовых расследований Гродненского КГК проводило в начале 2002 года. Были обнаружены нарушения белорусского законодательства со стороны шести партнеров фабрики — российских давальческих фирм. Каждой из них, согласно результатам проверки, были начислены доплата налогов и финансовые санкции. Для обеспечения их изъятия заместитель Ларионова Оксана Древницкая вынесла предписание о приостановлении расчетов с этими фирмами и запрете отгрузки им продукции слонимской фабрики.

Однако через две недели после этого Ларионов подписал приказ об отмене «в порядке исключения» предписания своего зама только в отношении фирмы «Линдерс». В результате вмененные КГК экономические санкции с фирмы взысканы не были. Государство потеряло почти 36 млн. рублей — налоги, санкции и пеня. Следствие квалифицирует эту сумму как «особо крупную», а последствия для государства — как «тяжкие». Уголовное дело против Ларионова возбуждено по ч. 3 ст. 424 УК, которая предусматривает до 8 лет лишения свободы.



■ Митинг рабочих Слонимской КПФ, 28 января 2004 года

В формулировке диспозиции этой уголовной статьи есть оговорка о совершении преступления из «иной личной заинтересованности». Однако в чем состояла заинтересованность Александра Ларионова, следствию не удалось обнаружить.

«Законных оснований для отмены предписания у него не было никаких. Если бы удалось определить эту личную заинтересованность, к этой статье добавилась бы другая, — сказал один из следователей областной прокуратуры, пожелавший не называть своего имени. — У него должен был быть только один интерес — интерес государства».

Александр Ларионов своей вины не признает. По словам его адвоката Людмилы Таранко, «интерес» его на момент совершения инкриминируемых действий состоял в том, чтобы не навредить Слонимской камвольно-прядильной фабрике, не оставить ее без партнеров, которые обеспечивают производство сырьем и забирают продукцию: «Вы же помните, какие статьи проходили в прессе в то время о слонимской фабрике! Ведь она была на грани остановки, в катастрофической ситуации, а 2,5 тыс. человек практически остались без работы! На Ларионова было оказано давление: просили, чтобы он вошел в положение предприятия. Конечно, устно, кто же будет оставлять документы!»

Согласно позиции защиты, на момент отмены предписания Александр Ларионов поступал совершенно законно. По действовавшему тогда указу президента N722 от 2000 года, до определения окончательного размера ущерба он имел право снять все запреты по расчетам слонимской фабрики с «Линдерс». А размер ущерба был установлен только в конце марта, почти через месяц после того, как Ларионов отменил предписание своего заместителя.

Кроме того, Ларионову удалось выяснить, что из всех шести проверенных давальцев Слонимской камвольно-прядильной фабрики только ООО «Линдерс» было официально зарегистрировано в Москве и платило налоги.

Отмена предписания попала в поле зрения прокуратуры довольно скоро. Обвинение вынесла республиканская прокуратура после полугодовой проверки областных коллег. Ларионов подал в отставку еще во время проведения проверки. Сейчас он является директором строительного СП.

«Белорусская газета»

УЛАДА

АДЧЫТАЛІСЯ НА РАЁННЫМ УЗРОЎНІ



▪ Тут прымаюць мясцовыя рашэнні

27 лютага ў Слоніме прайшла пятая сесія раённага Савета дэпутатаў, на якой выканаўчая і прадстаўнічая ўлады рабілі справаздачу аб сваёй працы ў мінулым годзе, а таксама прынялі і зацвердзілі шэраг рашэнняў на будучыню.

ВЫКАНАЛІ І НЕ ВЫКАНАЛІ

Са справаздачай аб рабоце Слонімскага райвыканкама ў 2003 годзе выступіў яго старшыня Мечыслаў Касцюк. Старшыня зазначыў, што асноўная праца выканаўчага камітэта ў мінулым годзе была накіравана на выкананне прагнозных паказчыкаў ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі Слонімшчыны, якія давялі абласным Саветам дэпутатаў і аблвыканкамам. Выканалі 15 з 19 даведзеных паказчыкаў.

У прамысловасці забяспечылі патрэбны тэмп росту вытворчасці, экспарту і імпарту прадукцыі. У сельскай гаспадарцы выканалі паказчыкі росту валавой прадукцыі, продажу дзяржаве малака, яек, збожжавых і збожжа-бабовых культур, а таксама масла насення рапсу. Будаўнікі выканалі заданне ўводу ў дзеянне жылля. Таксама ў раёне забяспечана выкананне мэтавага паказчыка па энергазберажэнні, прыцягненні інвестыцый у асноўны капітал, а паказчыкі па тэмпах росту рознічнага тавараабароту, платных і бытавых паслуг перавыканалі.

Не дасягнулі прагнозных паказчыкаў па вытворчасці спажывецкіх тавараў у прамысловасці, а ў сельскай гаспадарцы недавыканалі заданні продажу дзяржаве жывёлы, птушкі, ільновалакна і цукровых буракоў.

Што датычыцца непасрэдна працы райвыканкама, то ў 2003 годзе праведзена 26 пасяджэнняў і прынята 1 150 рашэнняў па розных аспектах жыццядзейнасці раёна.

ПЛАНУЮЦЬ ЗРАБІЦЬ У 2004 ГОДЗЕ

Старшыня райвыканкама Мечыслаў Касцюк у сваім справаздачным дакладзе агучыў таксама планы на 2004 год.

Па яго словах, сёлета адкрыюць новы рынак на вуліцы Касаўскі тракт (Энка), а ў Альбярціне плануецца размясціць мінірынак. У гэтым годзе прадугледжана ўвесці ў эксплуатацыю 85 кватэр агульнай плошчай 6 475 кв. м. У Слоніме пабудуюць 98 кватэр агульнай плошчай 6 374 кв. м.

У сёлетніх планах — сярэдні рамонт аўтамабільных дарог агульнага карыстання, бягучы і капрамонт гарадскіх вуліц і дарог, добраўпарадкаванне ўнутрыквартальных праездаў і тэрыторый.

У 2004 годзе намечана весці газіфікацыю ў вёску Сялявічы (5,7 км за кошт сродкаў інавацыйнага фонду "Белпалівагаз"), плануецца закончыць пракладку газаправода ў СВК "Дзераўноўскі" за сродкі аблгаза ў суме 300 млн. рублёў, а таксама закончыць закальцоўку вуліц Войкава, Дзекабрыстаў і Шчорса ў Слоніме.

Сёлета ў рамках праграмы рацыяналізацыі сеткі ўстаноў адукацыі прадугледжана рэарганізацыя Сасноўскай СШ у сярэднюю школу-сад, Дзеравянчыцкай БШ — у пачатковую школу-сад і Партызанаўскай БШ — у базавую школу-сад.

Рашэннем райвыканкама з 1 сакавіка гэтага года ўсе 25 вясковых фельчарска-акушэрскіх пунктаў перададзены на баланс Слонімскага ТМА, а ўсе ўстановы культуры з 1 студзеня 2004 года фінансуюцца аддзелам культуры райвыканкама.

Звярнуўшыся да прысутных у канцы свайго выступлення, Мечыслаў Касцюк сказаў, што "ў 2004 годзе лягчэй не будзе, трэба прама сказаць, будзе яшчэ больш складана..."

ДЭПУТАЦКАЯ ПРАЦА

Са свайго боку са справаздачным дакладам аб рабоце раённага Савета дэпутатаў 24-га склікання выступіў яго старшыня Сяргей Рагозік. Ён адзначыў, што на Слонімшчыне функцыянуе раённы і 12 сельскіх Саветаў дэпутатаў, у якіх налічваецца 192 дэпутаты: 34 — у раённым Савеце і 158 — у сельскіх Саветах дэпутатаў, працуюць таксама 4 пастаянныя камісіі, у якія ўваходзяць 32 дэпутаты. Між іншым, Сяргей Аляксандравіч заўважыў, што яго не задавальняе актыўнасць дэпутацкіх камісій пры падрыхтоўцы сесій райсавета.

За справаздачны перыяд дэпутаты правялі 5 сесій райсавета, на якіх разгледзелі звыш 40 пытанняў. Як прыклады Сяргей Рагозік называў пытанні "Аб стане законнасці і правапарадку ў горадзе і раёне і мерах па іх умацаванні", "Аб прагнозе сацыяльна-эканамічнага развіцця Слонімскага раёна ў 2004 годзе", "Аб бюджэце раёна ў 2004 годзе" і іншыя, сярод якіх згадаў таксама рашэнне дэпутатаў аб увядзенні мясцовых збораў. Старшыня райсавета расказваў пра закупку ў насельніцтва ў мінулым годзе малака, пра добраўпарадкаванне вёсак і работу дэпутатаў з насельніцтвам.

РАЙСАВЕТ РАШЫЎ І ЗАЦВЕРДЗІЎ

На пятай сесіі райсавета зацвердзілі праграму "Моладзь", накіраваную на паляпшэнне ў 2004—2006 гадах сацыяльна-эканамічных умоў жыцця моладзі горада і раёна.

Сесія прыняла рашэнне аб уплаце ў бюджэт раёна часткі прыбытку раённымі унітарнымі прадпрыемствамі, маёмасць якіх знаходзіцца на праве гаспадарчага ведання.

Рашэннем райсавета ад уплаты зямельнага падатку ў 2004 годзе вызвалены жыхары вёсак Капусты, Гуменікі, Вербалаты, Тушэвічы, Падгорная, Ваўчуны, Вялікая Кракотка, Юхнавічы, Плаўскія, Клепачы, Ваўчкі, Какошычы, Новыя Арловічы, Грынькі, Махначы, Масілавічы, Азарычы, Парэчча, Задвор'е, Нізы, Байкі, Мілаванне, Бабынічы і Ганькі.

Савет дэпутатаў вырашыў знізіць з 1 сакавіка стаўку зямельнага падатку на 50% на зямельныя ўчасткі, якія знаходзяцца ў карыстанні рэлігійных арганізацый на тэрыторыі горада і раёна.

Райсавет прыняў рашэнне перадаць ва ўласнасць Слонімскага райспажыўсаюза недабудаваны склад-краму і кампрэсарную на вуліцы Савецкая, 86 для выкарыстання іх пры будаўніцтве крытага рынку на Школьнай вуліцы.

На пятай сесіі дэпутаты зацвердзілі спіс і план-графік прыватызацыі прадпрыемстваў камунальнай уласнасці Слонімскага раёна. На працягу 2004—2007 гадоў плануецца прыватызаваць 12 прадпрыемстваў. 11 з іх будуць пераўтвораны ў адкрытыя акцыянерныя таварыствы, і 1 аб'ект (гандлёва-вытворчае прадпрыемства "Шчара") мяркуецца прадаць на конкурснай аснове ўжо ў гэтым годзе. Сёлета таксама прыватызаваць крамы "Усход" і "1 000 дробязей". Сваё рашэнне аб прыватызацыі райсавет прыняў з мэтай выканання рэкамендацый калегіі Гродзенскага абласнога тэрытарыяльнага фонду дзяржаўнай маёмасці.

Падрыхтаваў
Мікола КАНАНОВІЧ

••• ИНФОРМАЦИЯ •••

СЛОНИМСКИЙ РЫНОК ЦЕНЫ НА ПРОДУКТЫ

09.03.2004 г.

Наименование	Цена за 1 кг
Молоко (1 л)	600 руб
Творог	3 000 руб.
Масло	7 000 руб.
Яйца (1 дес.)	1 150 - 2 000 руб.
Картофель	3 000 руб. за ведро
Капуста квашеная	700 - 1 000 руб.
Морковь	400 - 500 руб.
Лук	900 - 1 200 руб.
Свёкла	350 руб.
Чеснок	150 - 250 руб. за головку
Помидоры	4 000 - 4 500 руб.
Огурцы	3 500 - 4 000 руб.
Яблоки	800 - 2 800 руб.
Апельсины	2 200 - 3 500 руб.
Мандарины	3 000 - 3 300 руб.
Лимоны	2 500 - 3 300 руб.
Киви	550 руб. шт.
Гранаты	–
Бананы	2 000 руб.
Свинина	4 500 - 7 850 руб.
Говядина	–
Телятина	–
Сало свежее	3 900 руб.
солёное	4 800 руб.
Селёдка	3 200 руб.
Макаронные изделия	1 150 - 1 200 руб.
Гречка	1 200 - 1 600 руб.
Рис	1 100 - 1 300 руб.
Мука	2 000 руб. (2кг)
Сахар	не продаётся
Постное масло (1 л)	1 900 - 2 500 руб.
Мёд	12 000 руб.

КУРСЫ ОБМЕНА ВАЛЮТ

09.03.2004 г.

"Беларусбанк"	Покупка	Продажа
1 USD	2125	2165
1 EURO	2600	2720
1 ZL	520	555
1 RUR	73	76

"Белпромстройбанк"	Покупка	Продажа
1 USD	2135	2163
1 EURO	2610	2680
1 ZL	530	570
1 RUR	74,5	74,9

"Белагропромбанк"	Покупка	Продажа
1 USD	2125	2160
1 EURO	2600	2660
1 ZL	520	580
1 LAT	3900	4130
1 LIT	700	810
1 UAH	370	420
1 GBP	3900	4140
1 RUR	74	76

ЗДАРЭННЕ

ЗАТРЫМАЛІ "АМАТАРА" ЖЫВАПІСУ

У крымінальную хроніку "Міліцэйскага весніка" трапіў на мінулым тыдні 23-гадовы жыхар Слоніма.

Малады чалавек вызначыўся тым, што на вуліцы Першамайскай нахабна забраў выстаўленую на продаж карціну і даў дзёру. Аднак атрымаць эстэтычную асалоду ад крадзенага твора мастацтва ён не паспеў.

Мікола КАНАНОВІЧ

ЗАГІНУЎ ЖЫХАР УКРАІНЫ

Недалёка ад вёскі Шундры адбылася аварыя, падчас якой загінуў жыхар Украіны.

Рухаючыся па шашы, два легкавікі сустрэліся "лоб у лоб". Пасля сутыкнення адзін чалавек загінуў, а другога з цяжкімі траўмамі даставілі ў бальніцу.

Сяргей ЧЫГРЫН


КУЛЬТУРА

ГУЧАЛА МУЗЫКА ЧАЙКОЎСКАГА

У Слонімскай школе мастацтваў адбылася вечарына, прысвечаная музычнай творчасці Пятра Чайкоўскага.

Вечар арганізавала і правяла Людміла Навумава. Прысутныя пазнаёміліся з жыццём слыннага кампазітара і яго музычнай дзейнасцю. Падчас вечарыны гучалі творы Чайкоўскага, якія выконвалі юныя музыканты Слоніма — Лера Панашчык і Даша Анікеева, а таксама музычныя педагогі нашага горада.

Таццяна ПЛАХЕТКА



▪ Іграе Лера Панашчык

СВЯТА

ПАВІНШАВАЛІ СВАІХ МАМ

Напярэдадні жаночага свята 8 Сакавіка ва ўсіх дзіцячых садках і школах нашага горада прайшлі ранішнікі і вечары, прысвечаныя гэтаму дню.

Наша карэспандэнтка пабывала на такім ранішніку ў садку № 8, дзе малыя разам са сваімі выхавальніцамі ладзілі свята. У гэты дзень гучалі песні, вершы пра мам і бабуль, дзеткі паказвалі майстэрства ў рухомых танцах. А пасля маленькія выхаванцы ўручылі падарункі сваім мамам.

Таццяна ПЛАХЕТКА



▪ Давай патанцуем

СОЦИУМ

БЕЖЕНЦЫ:

НЕЗВАНЫЕ ГОСТИ или УСТАЛЫЕ ПУТНИКИ?

■ Янина МЕЛЬНИКОВА

В редакцию "ГС" позвонил слонимчанин Дубровский и стал жаловаться на засилье "лиц кавказской национальности".

— Они повсюду, — говорил наш читатель. — Просто не понимаю: как их прописывают, как они устраиваются на работу? Тут у самого сын, закончив институт, без работы сидит, а они... Это просто ужасно, почему наше правительство ничего не делает, зачем пускает в страну беженцев, они же бандиты?!

Как оказалось, зарегистрированных беженцев в Слонимском районе нет. О них неизвестно ни паспортно-визовой службе, ни в отделе информации, ни в отделе социальной защиты.

Но в районе живет несколько семей, приехавших из Чечни. Чеченцы работают в городе, их дети учатся в школах, посещают внешкольные учреждения. Их права и обязанности гарантирует белорусское государство, но на помощь они не рассчитывают. Причина тому — отсутствие статуса беженцев.

КТО ТАКИЕ БЕЖЕНЦЫ?

Беженец — это человек, который не является гражданином Республики Беларусь и находится на ее территории в силу опасений стать жертвой преследований в своей стране по признаку расы, религии, гражданства, национальности, принадлежности к определенной социальной группе или политических убеждений. Люди покидают свои страны из-за нарушения их гражданских и политических прав, бегут от стихийных бедствий и войн.

СКОЛЬКО ИХ В БЕЛАРУСИ?

В 2003 году в Беларуси статус беженцев получили более 700 иностранных граждан. Среди них больше всего выходцев из Афганистана (511 человек). Далее по количеству беженцев, проживающих в Беларуси, следует Грузия (91 человек), Таджикистан (28 человек), Азербайджан (27 человек), Эфиопия (23 человека), Палестина (9 человек), Иран (5 человек), Индия (2 человека), Армения, Ирак, Камерун, Либерия, Руанда — по 1-му человеку из каждой страны. Ежеквартально с ходатайством о предоставлении статуса беженцев обращаются 30–40 иностранных граждан.

В каждой области даже определены квоты на принятие беженцев. Так, Гродненская область в прошлом году могла принять только 10 семей.

ПОЧЕМУ ЧЕЧЕНЦЫ НЕ БЕЖЕНЦЫ?

Существует ряд государств, временное пребывание в которых до прибытия в Беларусь является основанием для отказа в регистрации в качестве беженца. Среди них Латвия, Литва, Польша, Россия и Украина.

Вот почему семьи слонимских чеченцев статуса беженцев не имеют. По признанию Аслана, главы одного из семейств, несмотря на то что белорусы славятся своим гостеприимством, он не раз ловил на себе косые взгляды и слышал за спиной: "Понаехали тут!" И хотя у его детей проблем в школе и во дворе пока не возникало, он не исключает, что со временем они могут появиться.

Аслан и его семья уже прижились в нашем городе, но про возвращение на Родину говорят все чаще и чаще.



■ В поисках спокойной жизни

МИГРАНТЫ — НЕ БЕЖЕНЦЫ

Другое дело — мигранты. Они оставляют свой дом добровольно, в поисках лучшей жизни. Большинство торговцев на наших рынках как раз и ищут возможность поправить свое экономическое положение.

Именно их присутствие так раздражает слонимчанина Дубровского. Но границы нашего государства открыты, а при условии, что иностранный гражданин становится на учет в паспортно-визовой службе, жить в Беларуси он может сколько угодно.

НАШИ ЗА ГРАНИЦЕЙ

Беженцы из Беларуси — тема особая. Причин для бегства множество: политические, экономические, экологические, а также религиозные.

Журналисту "ГС" знакомы случаи, когда слонимчане уезжали на Запад, выдумывая себе легенды о притеснении, чтобы получить статус беженцев. Зачем? Не хотели жить на родине в нищете и бесправии.

ХОРОШО ТАМ, ГДЕ НАС НЕТ

Вот и получается: одни бегут к нам, другие — от нас. И как всегда, верна пословица: хорошо там, где нас нет.

А там, где мы есть, мы ищем тысячи причин оправдать свое нежелание быть терпимыми к другим людям, забывая при этом, что живем в одном доме и места в нем должно хватать всем. ■

НАВІНА

У ПАДАРУНАК МУЗЕЮ ЮРЫЯ ГАГАРЫНА

У горадзе Гагарыне Смаленскай вобласці прайшлі традыцыйныя штогадовыя чытанні, прысвечаныя 70-годдзю першага касманаўта Юрыя Гагарына.

У гэтых чытаннях прыняла ўдзел таксама беларуская дэлегацыя. Сярод дэлегатаў быў і наш зямляк скульптар Іван Міско. Ён перадаў мясцоваму мемарыяльнаму музею Гагарына бюст касманаўта.

Сяргей ЧЫГРЫН

ПЫТАННЕ – АДКАЗ

ПРА ПАЧАК ЗАПАЛАК

Наша чытачка прыслала ў рэдакцыю ліст з пытаннем. Яе цікавіць, колькі запалак павінна быць у адным пачку.

Справа ў тым, што калі яна купіла запалкі і палічыла іх, то ў кожным пачку аказалася розная колькасць запалак: у адным — 38, у другім — 48, у іншых — 46, 42, 49 і г. д. Сапраўды, а колькі насамрэч запалак павінна быць у адным пачку?

Некалі ў Савецкім Саюзе на пачку запалак пісалі, што ў їм знаходзіцца 60 штук. Цяпер на беларускіх пачках з запалкамі такога не пішуць.

Карэспандэнт "ГС" патэлефанаваў у ААТ "Барысаўдрэў" і ў ААТ "Пінскдрэў", дзе выпускаюцца запалкі. У аддзеле маркетынгу фабрыкі ў Барысаве сказалі, што ў адным пачку ў сярэднім павінна быць 50 запалак. А вось у Пінску паведамілі, што ў тых пачках, якія выпускае "Пінскдрэў", у сярэднім налічвацца 45 запалак. Гэта найперш звязана з аўтаматычнай тэхналогіяй і з меншымі памерамі саміх пачкаў.

Сяргей ЧЫГРЫН

МЕДЫЦЫНА

НЕ ЎЗЯЎ НА СЯБЕ АДКАЗНАСЦІ

■ Мікола КАНАНОВІЧ

Вечарам 2-га сакавіка 90-гадовую жыхарку Сянькоўшчыны Любоў Зянько сваякі прывезлі на прыватнай аўтамашыне ў райбальніцу. У бабулі адкрыўся крывацёк, і ў Сянькоўшчынскім ФАПе ёй выпісалі накіраванне на лячэнне ў горад.

Прыехалі прыкладна каля 21-ой гадзіны. У прыёмным пакоі прачакалі дзве гадзіны, пакуль прыйшоў дзяжурны доктар. Урач паглядзеў хворую і сказаў, што яна ўжо ў такім узросце і ў цяжкім стане, што ён не возьме на сябе адказнасці пакінуць бабулю ў бальніцы. Сваё рашэнне доктар патлумачыў тым, што прывезлі яе не на машыне "хуткай дапамогі". Было ўжо амаль апоўначы, і сваякам нічога не заставалася, як адвезці бабулю на кватэру да дачкі.

Назаўтра ў рэдакцыю газеты патэлефанавала ўнучка хворай бабулі Аксана Таранеўская, расказала гэтую гісторыю і сказала, што бабуля так нацярпелася ўчора ў прыёмным пакоі, пакуль чакала доктара і падчас агляду (нават трапіла прытомнасць), што сення ўжо не хоча, каб выклікалі "хуткую дапамогу" і везлі яе ў бальніцу лячыцца. "Хачу спакойна памерці дома", — так, па словах унучкі, выказала сваё апошняе жаданне хворая.

Аднак наступае такі момант, калі хворым і іх блізкім не прыходзіцца выбіраць: хачу — не хачу, а неадкладна трэба звяртацца па дапамогу да дактароў.

У прыёмным пакоі пацвердзілі, што Любоў Зянько сапраўды прывозілі 2-га сакавіка, а лячыцца паклалі ў інфекцыйную бальніцу. Можна здзіўляцца і абурацца, як Аксана Таранеўская, што шлях яе хворай бабулі з Сянькоўшчыны да бальнічнай палаты аказаўся такім доўгім і цяжкім. Толькі ўсе мы даўно і добра ведаем, што, каб трапіць да доктара, трэба выстаяць (выседзець ці вылежаць) чаргу практычна ў любой дзяржаўнай медыцынскай установе. І нічога з гэтым не зробіш, бо так пабудавана ўся наша сённяшняя сістэма аховы здароўя. Дактары ў гэтай сістэме працуюць як могуць і, па магчымасці, пазбягаюць браць на сябе адказнасць за чужое жыццё і здароўе.

Толькі ў заходніх фільмах мы можам убачыць стандартную сітуацыю, калі хворага ў крытычным стане прывозяць у бальніцу і адразу з'яўляюцца медыкі, якія ўжо ў калідоры пачынаюць неадкладна яму дапамагаць. У Беларусі такое магчыма хіба ў сталічных платных клініках ды ў спецыякарнях не для ўсіх. У нас жа нават "хуткую дапамогу" ў вёску выклікаць бывае вельмі праблематычна. ■

ЗДАРЭННІ

ГРАБЕЖ НА БРЭСЦКАЙ ВУЛІЦЫ

Вечарам 6 сакавіка каля дома №95 на Брэсцкай вуліцы раней падсудны мясцовы жыхар К. накінуўся на жанчыну, адабраў у яе сумачку і ўцёк.

Работнікі міліцыі хутка затрымалі рабаўніка. Узбуджана крымінальная справа.

ЗЛАДЗЕЯЎ ПАЦЯГНУЛА НА САЛОДКАЕ

На мінулым тыдні двое раней падсудных жыхароў Альбярціна, адзін з якіх няпоўнагадовы, разбурылі вуллі і забралі мёд у гаспадара дома на Баранавіцкай вуліцы.

Аднак аматараў чужога мёду хутка затрымалі.

Мікола КАНАНОВІЧ

КАМАНДЗІРОЎКА


Фота Тацяны ПЛАХЕТКА

▪ На вуліцах Дзятлава — снежныя гурбы. Хай сабе ляжаць, як пацяплее — самі растануць

ДЗЯТЛАВА – ГОРАД КАНТРАСТАЎ

▪ Валерый КАВАЛЕНКА

У Дзень беларускай міліцыі інспектарам Дзятлаўскай ДАІ адпачываць не прыйшлося. Ужо ў восем гадзін раніцы прыйшло паведамленне пра аварыю на шашы Дзятлава—Слонім каля павароту на дом-інтэрнат.

Аўтафургон MAN паварочваў, калі шафёр не справіўся з кіраваннем. Машына апынулася на абочыне, па дарозе збіўшы знак аўтобуснага прыпынку. Гэтае здарэнне абышлося без ахвяр, а кіроўцу машыны з траўмамі сярэдняй цяжкасці адвезлі ў дзятлаўскую бальніцу.

З гэтага здарэння пачалася камандзіроўка карэспандэнтаў "ГС" у суседні раён. Дарэчы, на месцы аварыі мы апынуліся амаль адначасова з міліцыяй і ў якасці панятых дапамаглі інспектарам, якія праводзілі замеры, склалі схему дарожна-транспартнага здарэння.

Такі пачатак дня не змарнаваў настрою на працу, тым больш што праз паўгадзіны мы былі ўжо ў Дзятлаве. І першае, што кінулася ў вочы, – вуліцы, занесеныя снегам і слізкія дарогі. Было такое ўражанне, што камунальныя службы ў горадзе ўжо пачалі святкаваць 8 Сакавіка, – а раз наступіла каляндарная вясна, то снег хутка і сам растане. А дзятлаўчане на гэты конт мяркуюць інакш. Былы старшыня выканкама пайшоў на павышэнне ў іншы раён, а новага пакуль не прыслалі, вось і разбэсціліся камунальшчыкі. Дарэчы, і на трасу снегаўборачная тэхніка выйшла толькі пад абед. Расчухаліся, што сабе танней будзе дарогу пачысціць, чым пасля машыны з кюветаў выцягваць ды людзей па бальніцах развозіць.

Каб ізноў нас не абвінавацілі ў тым, што "ГС" толькі дрэннае заўважае ва ўсім, адзначым і тое добрае, што зроблена за апошні час. Напрыклад, у мінулым годзе адчыніла свае дзверы першая ў Дзятлаве гімназія, алейка Дошак гонару ўжо не глядзіць слепа на гараджан пустымі дзіркамі замест партрэтаў найлепшых людзей – тут з'явіліся каляровыя фатаграфіі з краявідамі Дзятлава. А ў Наваельні, куды карэспандэнты таксама заехалі, адрамантавалі гідраэлектрастанцыю.

Таксама ў Наваельні знаходзіцца рэспубліканскі дыспансер для хворых на сухоты. Здавалася б, сёння барацьба з гэтай хваробай у краіне хіба што не на дзяржаўным узроўні кантралюецца, а ў дыспансеры ідуць пастаянныя скарачэнні. І не толькі медперсаналу. З трох аддзяленняў на сёння дзейнічае толькі адно.


Яшчэ адна медыцынская ўстанова Дзятлаўшчыны – санаторый "Радон" – пачувае сябе значна лепш за свайго старэйшага "сухотнага" брата. За дзесяць гадоў санаторый набыў вялікую папулярнасць не толькі сярод беларусаў, але і замежных гасцей, напрыклад, з Расіі і Германіі. Спрыяе гэтаму якаснае абслугоўванне і сапраўды гаючыя ўласцівасці мясцовых гразей і радонавай вады, прымяненне якіх у лячэнні літаральна ставіць людзей на ногі.

Але трапіць у санаторый не так проста. Танныя пуцёўкі хутка расхопліваюць, а каб купіць пуцёўку за поўны кошт, трэба выкласці 400 тысяч рублёў. Калі ж вы хочаце абслугоўвання вышэйшага разраду з пражываннем у нумары "люкс", то рыхтуйце дзесьці каля 600 даляраў.

Дзятлава – горад супрацьлегласцей. Трэба толькі больш уважліва агледзецца навокал. Альбо, калі лянота зрабіць гэта самому, прачытаць у газеце.

Вось толькі мясцовая прэса (газета "Перамога") маўчыць і абмяжоўваецца, па вялікім рахунку, толькі афіцыйнай хронікай. Адкуль тады людзям даведацца пра тое, што робіцца насамрэч? Толькі з незалежных выданняў. У кіёсках "Белсаюздруку" гэтыя газеты не залежваюцца. І зусім інакш ставіцца да незалежнай (ці "апазіцыйнай" – па тэрміналогіі ўлады) прэсы гэтая самая ўлада на месцах. Як стала дакладна вядома карэспандэнту "ГС", на адной з планёрак аддзела культуры абмяркоўвалася пытанне наконт платных паслуг насельніцтву горада і раёна. Напрыклад, выдаваць наведвальнікам бібліятэк перыёдыку за грошы. Дырэктар дзятлаўскай бібліятэкі ўзрушана заўважыла: тое, што выпісваецца, ніхто за грошы чытаць не будзе, а "Газету Слонімскую" і "Народную Волю" выпісваць забараняюць. Вось так, кулуарна, без дакументальнага пацверджання, улада парушае свае ж законы.

Застаецца толькі спадзявацца, што наступным разам, калі карэспандэнты "ГС" наведаюць Дзятлава, горад сустрэне па-іншаму, а чыноўнікі зменяць свае погляды на незалежную прэсу і больш дасканала перачытаюць Канстытуцыю і Закон аб друку. ▪



Фота Валерыя КАВАЛЕНКІ

▪ А вось так "жыве Беларусь". Праўда, не ўся


Фота Тацяны ПЛАХЕТКА

▪ Аварыя на шашы. Абышлося без ахвяр

КОНКУРСЫ

МИСС ВЕСНЯНОЧКА

В малом зале Слонимского РДК прошел конкурс на звание "Мисс Весняночка" среди девушек Слонимского государственного медицинского училища. Он был посвящен весеннему празднику — 8 Марта.

В конкурсе девушки соревновались в мастерстве представить себя, в запоминании предметов, в показе мужчин с их точки зрения. Также красавицы могли проявить себя в конкурсе составления композиций из цветов и их защите, в танцевальном конкурсе вместе со своими партнерами.

Хотя за окнами стояла не весенняя погода, в зале кипели страсти. Жюри было нелегко выбрать среди семи участниц одну достойную. «Мисс Весняночкой» стала Ольга Толкач. Звание «Мисс Элегантность» досталось Людмиле Бурчиевой, «Мисс Эрудит» – Любови Сенкевич, «Мисс Диско» – Инне Ходар. «Мисс Хозяюшкой» оказалась Юлия Дервяновская, «Мисс Фото» – Ирина Щенснович, «Мисс Обаянием» – Татьяна Ситко.

Все участницы получили подарки от администрации училища и денежное вознаграждение.

Дмитрий НИЧИПОР

САМАЯ АБАЯЛЬНАЯ І ПРЫВАБНАЯ

У памяшканні актавай залы Слонімскай КПФ нядаўна гучалі не скаргі на кіраўніцтва і незадавальненне працоўных, а чароўная музыка і прыгожыя песні.

На сцэне прадпрыемства знаходзіліся маладыя прыгажуні – навучэнкі ПТВ-129 тэкстыльшчыкаў, якія паказвалі свае здольнасці і эрудыцыю. Прысутным пашчасціла пачуць песні ў добрым выкананні і ўбачыць цікавыя харэаграфічныя эцюды, павысіць свае пазнанні ў мастацтве і літаратуры, даведацца пра навінкі ў свеце моды. Менавіта такімі былі конкурсы ў рамках мерапрыемства "Самая абаяльная і прывабная", прысвечанага 8 Сакавіка. Дзяўчыны-ўдзельніцы парадавалі гледачоў і сваім знешнім выглядам, і прыгожым убраннем, і эрудыцыяй.

Вельмі прыемна, што не засталіся па-за ўвагай просьбы, звернутыя да некаторых прыватных прадпрымальнікаў, аб дапамозе правесці конкурс. Таму красаваліся некаторыя дзяўчаты ў шыкоўных сукенках з салона Кацярыны Леванковай.

Імпрэза нікога не пакінула абыякавым. Бурныя апладысменты, кветкі ўдзельнікам, шматлікія выклікі на біс – найлепшае пацверджанне гэтаму. А пераможцай конкурсу стала навучэнка 8 групы швачак, краўцоў Рэната Брайчук. Аднак ніхто з удзельніц не застаўся без прызоў. Усім уручылі падарункі і прысудзілі званні "Міс Пяшчота", "Міс Чароўнасць", "Міс Загадка", "Міс Усмешка" і іншыя. Свята ўдалося на славу, а некаторых навучэнак нават запрасілі на ўрачыстасць з нагоды свята – канцэрт, які адбудзецца для жанчын фабрыкі, якія працуюць.

Мікалай РАДЫЁНАЎ

НАШЫ ЗЕМЛЯКІ

З ДЫНАСТЫІ ДАКТАРОЎ

■ Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ

Кожны дзень Тамара Міхайлаўна прыязджае на працу крыху раней, чым увесь персанал санаторыя "Радон". Высокая, стройная, элегантна апранутая маладая жанчына падымаецца ў свой кабінет на другім паверсе.

У калідоры яшчэ ціха: людзі, якія адпачываюць у санаторыі, яшчэ снедаюць. І пакуль яны пачнуць займаць чаргу ля дзвярэй кабінета, можна пабыць у цішыні, паліць кветкі, якіх тут вельмі шмат. Яны на падаконніку, на сценах, на спецыяльных падстаўках. Адны цвітуць, другія радуюць вока пышнай зялёнай лістотай. Кожную расліну Тамара Міхайлаўна пасадзіла сваімі рукамі, сама ж і даглядае.

— Кветкі — мая слабасць, — прызнаецца маладая жанчына, і на яе прыгожым твары свеціцца ўсмешка.

Ды, між іншым, добрых захапленняў у яе шмат. Але пра гэта потым.

Тамара Грос нарадзілася і вырасла ў пасёлку Першамайскі Лідскага раёна. Яна з дынастыі дактароў. Колькі сябе памятае, медыцына была царыцай яе думак, бо дома шмат гаварылі і пра цяжкасці, і пра поспехі, пра міласэрнасць, якая абавязкова павінна быць уласціва таму, хто выбраўшы прысвяціць сябе медыцынскай справе.



■ Доктар Тамара Грос

Сумленне і душа ў гэтага чалавека павінны быць такімі ж чыстымі, як і халат, які ён апранае кожны дзень.

Яе тата быў стаматолагам, мама — медыцынскай сястрой. Яны так любілі сваю прафесію, так захапляліся ёю, што ўсе тры дачкі вырашылі прысвяціць сябе медыцыне. Тамара пасля заканчэння Гродзенскага медыцынскага інстытута стала доктарам-тэрапеўтам, сястра Ірына — неўрапатолагам. Цяпер яна жыве і працуе ў Чэрыкаве Магілёўскай вобласці. Другая сястра Лена — зубны тэхнік. Працуе ў Лідзе. І ні адна з іх не каецца, што прысвяціла сябе медыцыне. Наадварот, усе сёстры любяць сваю работу, ганарацца ёю.

Пасля заканчэння медыцынскага інстытута Тамара Міхайлаўна прыехала працаваць у Дзятлаўскую раённую бальніцу. Была ардынатарам тэрапеўтычнага аддзялення. Аразу ж зарэкамендавала сябе ўмелым спецыялістам, чулым і спагадлівым чалавекам. У яе заўсёды хапала цярпення і часу выслухаць хворых. Чалавек, які трапіў у бальніцу з хворым сэрцам ці страўнікам, іншы раз расказваў доктару пра свае душэўныя перажыванні, цяжкасці быту. Яна ўмела шчыра паспагадаць, параіць, супакоіць. За гэта, а яшчэ за высокае прафесійнае майстэрства яе любілі пацыенты. І калі даведаліся, што Тамара Міхайлаўна перайшла працаваць у санаторый "Радон", засмучаліся і перажывалі. Сёмы год яна там, а ў Дзятлаве і цяпер ўспамінаюць доктара Грос самымі лепшымі словамі.

У санаторыі Тамара Міхайлаўна працуе фізіятрам і тэрапеўтам. Як тэрапеўт яна лечыць пятнаццаць чалавек. А як фізіятр дае кансультацыі ўсім, каму гэта неабходна, назначае працэдуры, некаторыя праводзіць сама. Да такіх адносяцца электрастымуляцыя і складаная лазерная тэрапія для дзяцей і людзей з асабліва цяжкімі хваробамі. А такіх нямала. У санаторыі лечаць захворванні апорна-рухальнага апарату, таксама неўралагічныя і гінекалагічныя, праводзяць рэабілітацыю.

Доктар Грос і тут карыстаецца вялікім аўтарытэтам, яе паважаюць і цэняць як шматлікія адпачывальнікі, так і калегі.

У гэтай прыгожай добрай жанчыны цудоўная сям'я. Муж Анатоль Аляксандравіч — прыватны прадпрымальнік. Сын Ігар — студэнт эканамічнага універсітэта. Малодшы ў сям'і — Валодзя. Мама марыць, каб ён стаў доктарам, каб не перарывалася дынастыя медыкаў. Дзеля гэтага бацькі аддалі яго вучыцца ў Лідскі ліцэй №1 у хіміка-біялагічны клас, каб належным чынам падрыхтаваўся да паступлення ў медыцынскі універсітэт. Цяпер Валодзя вучыцца ў 10 класе і лічыць, што медыцына — яго прызванне.

Жыве Тамара Міхайлаўна ў вёсцы Жукоўшчына і кожны дзень дабіраецца ў "Радон" на працу за добры дзесятак кіламетраў. Дарога займае нямала часу. Але, нягледзячы на гэта, маладая жанчына ўсё паспявае. Дома ў яе ўзорны парадак. А як надыходзіць вясна, шмат працуе на прысядзібным участку — вырошчвае розныя кветкі. Іх тут цэлае мора. Гаспадыня абменьваецца насеннем з многімі кветаводамі Беларусі. Яна нават не можа дакладна сказаць, якія кветкі самыя любімыя.

— Усе любімыя, — міла ўсміхаецца Тамара Міхайлаўна.

Яна шмат чытае і медыцынскай, і мастацкай літаратуры, а таксама цікавіцца літаратурай па вырошчванні кветак і сабакагадоўлі. Гэтае захапленне больш уласціва мужчынам, але Тамара Міхайлаўна вельмі любіць сабак, ездзіць у Мінск на спецыяльныя выстаўкі. І дома ў яе ёсць пудзель і аўчарка, якія прыносяць гаспадарам шмат радасці.

Гэтую жанчыну ведаюць ва ўсіх кутках Беларусі. І не толькі ў Беларусі, бо ў "Радоне" лечацца людзі з блізкага і далёкага замежжа. Той, хто адчуў на сабе яе дабрыню і міласэрнасць, спагаду і высокі прафесіяналізм, доўга будзе ўспамінаць доктара Грос добрымі словамі. І яна гэта заслужыла. ■

НАВІНЫ

АДМОВІЛІ Ў РЭГІСТРАЦЫІ "РАТУШЫ"

ГРОДНА. Гродзенскі гарвыканкам адмовіў у рэгістрацыі Фонду рэгіянальнага развіцця "Ратуша". Яго мяркуюць стварыць актывісты ліквідаванага аднайменнага грамадскага аб'яднання. Асноўная прычына адмаўлення — памылкі, знойдзеныя ў пададзеных рэгістрацыйных дакументах.

Як паведаміў БелаПАН былы кіраўнік "Ратушы" Алесь Мілінкевіч, пасля таго як летась Вярхоўны суд прызнаў ліквідацыю аб'яднання законным, яго актывісты вырашылі арганізаваць фонд рэгіянальнага развіцця з аналагічнай назвай. У гарвыканкам на рэгістрацыю перадалі дакументы. Пратрымаўшы іх у сябе каля двух месяцаў, гарадскія юрысты ў рэгістрацыі новай "Ратушы" адмовілі. Паводле слоў А. Мілінкевіча, яны заявілі, што некаторыя дакументы не ў парадку, што ў іх утрымліваюцца парушэнні артыкула 118 Грамадзянскага кодэкса. Але канкрэтызаваць памылкі, якія ўтрымліваюцца ў рэгістрацыйных дакументах, у гарвыканкаме адмовіліся.

У найбліжэйшыя дні актывісты "Ратушы" збіраюцца звярнуцца з іскавой заявай у суд Ленінскага раёна горада Гродна, дзе хочуць абскардзіць неправамерныя дзеянні мясцовай "вертыкалі".

Паводле слоў А. Мілінкевіча, плануецца, што Фонд рэгіянальнага развіцця "Ратуша" будзе займацца падтрымкай грамадскіх ініцыятыў, накіраваных на развіццё грамадзянскай супольнасці ў Гродзенскім рэгіёне.

Андрэй АЛЕКСАНДРОВІЧ

ПРЕДПРИНИМАТЕЛЬ ОБЪЯВИЛ ГОЛОДОВКУ

ГРОДНО. Дмитрию Ивановскому присудили 10 суток ареста за организацию «митинга молчания» предпринимателей, который прошел 1 марта. В судебном зале 3 марта Ивановский заявил, что объявляет голодовку.

1 марта рядом с облисполкомом около 500 предпринимателей молча протестовали против ухудшения условий своей работы. Заместителя председателя общественного объединения "Перспектива" Дмитрия Ивановского среди них не было. Накануне акции его задержали с листовками, в которых предпринимателей приглашали прийти на "митинг молчания". За листовки Ивановского наказали штрафом в одну базовую единицу в Октябрьском районном суде города. А после митинга пригласили в Ленинский районный отдел милиции, чтобы обвинить в организации акции, на которой он не присутствовал. 3 марта судья Ленинского суда Наталья Козел посчитала, что он был организатором "митинга молчания" и наказала его десятью сутками ареста.

Радио «Свабода»

САВЕТЫ ПАДМАКАЮЦЬ

МАСТЫ. На чацвёртым паверсе дома Саветаў у Мастах знаходзяцца аддзел адукацыі райвыканкама і падатковая інспекцыя. Але работнікі гэтых устаноў у дажджлівы дзень запасаюцца парасонамі, бо цячэ дах. Вада пранікае ў кабінеты і калідор.

Многія кабінеты афарбаваныя ў рыжыя плямы, лінолеум патрэскаўся. Непрывабны выгляд мае калідор. А там, дзе размяшчаецца падатковая інспекцыя, лінолеум наогул знялі, бачна, што гніе паркет. Пытанне наконт рамонту будынка пакуль не вырашалася.

Алесь МАСТОЎСКІ

УЗНАГАРОДЗЯЦЬ НАСТАЎНІКА

МАСТЫ. Аддзел адукацыі райвыканкама выступіў з хадайніцтвам перад Міністэрствам адукацыі РБ аб узнагароджанні настаўніка інфарматыкі школы-гімназіі №1 Уладзіміра Дужыка за высокія паказчыкі ў працы па развіцці здольнасцей вучняў.

Выхаванцы Уладзіміра Адамавіча ўжо каторы год запар паспяхова выступаюць на абласных і рэспубліканскіх алімпіядах. Сёлета пераможцам абласной алімпіяды стаў вучань 11 класа Віктар Салалайка.

КАРЫСНЫЯ ПЛАТНЫЯ ПАСЛУГІ

МАСТЫ. У сувязі з адсутнасцю дастатковага фінансавання школам далі дазвол на аказанне платных паслуг. Гэта ў першую чаргу арэнда школьных сталовых, актавых залаў для правядзення мерапрыемстваў насельніцтва. Паступленні ад гэтых паслуг папоўняць пазабюджэтныя сродкі. Сюды яшчэ адносяцца даходы ад збору металалому, макулатуры, ахвяраванні бацькоў, шэфаў, спонсараў.

У мінулым годзе ў раённым аддзеле адукацыі гэты фонд склаў 120,4 мільёна рублёў. За гэтыя сродкі набылі мэблю і наглядную агітацыю.

ПАСЯБРАВАЛІ З ЛЮДЗЬМІ

МАСТЫ. На Нёмане паблізу выратавальнай станцыі пасялілася лебядзіная сям'я з трох птушак. Птушкі настолькі прызвычаіліся да людзей, што ежу бяруць проста з іх рук. Асабліва пасябравалі лебедзі з работнікамі станцыі. Калі тыя прыходзяць на працу, то белыя прыгажуны хутка падплываюць да берага і чакаюць пачастунку. Сяброўства настолькі блізкае, што людзям нават удалося прачытаць нумар на пярсцёнку адной акальцаванай птушкі.

Язэп ПАЛУБЯТКА

ДАМУШНІКІ ВЕДАЛІ, ДЗЕ ГРОШЫ ЛЯЖАЦЬ

ВАЎКАВЫСК. У жыхаркі Ваўкавыска з кватэры на вуліцы К. Цэткін зніклі амаль паўтары тысячы еўра. А пенсіянерка з вёскі Сядзельнікі Ваўкавыскага раёна аднойчы недалічылася 770 тысяч беларускіх рублёў.

Пацярпелай вясковай жыхарцы, аднак, пашчасціла ў тым, што яе крыўдзіцеля затрымалі. Ім аказаўся 37-гадовы раней падсудны жыхар Ваўкавыска. Цяпер зладзей павінен вярнуць жанчыне ўкрадзеныя грошы і трымаць адказ за злачынства.

Мікола КАНАНОВІЧ

НЕКАЛЬКІ МІНУСАЎ ПЕРАДВЫБАРЧАЙ КААЛІЦЫІ "5+"



Міхась ВАРАНЕЦ жыве ў Слоніме з 1993 года, вайсковы пенсіянер, маёр запасу. З 1994 года – сябра партыі Беларуская сацыял-дэмакратычная Грамада. У 1995–1999 гг. быў дэпутатам Слонімскага гарсавета, старшынёй пастаяннай камісіі па мясцовым самакіраванні. Кіраўнік грамадскага аб'яднання "Воля да развіцця".

■ Міхась ВАРАНЕЦ

Задоўга да абвяшчэння выбараў у Палату прадстаўнікоў пяць найбольш уплывовых апазіцыйных партый[1] і іх саюзнікі аб'ядналіся ў кааліцыю пад назвай Народная кааліцыя "5+" ("пяцёрка плюс") і пачалі працу падрыхтоўкі да выбараў.

Але гэтыя ж партыі, за выключэннем ПКБ, у 1999 і 2000 гадах гэтак жа актыўна байкатавалі выбары ў мясцовыя Саветы і Палату прадстаўнікоў.

Такая непаслядоўнасць, лёгкая і хуткая перамена, здавалася б, прынцыповых пазіцый уяўляецца значным мінусам кааліцыі, які можа пераважыць яе плюс.

АД БАЙКОТУ ДА ВЫБАРАЎ

У жніўні 2000 года, напярэдадні выбараў у Палату прадстаўнікоў, старшыня Аб'яднанай грамадзянскай партыі Анатоль Лябедзька заяўляў: "ОГП призывает бойкотировать выборы в лукашенковский "парламент". Почему? Нам нужна власть не для того, чтобы присосаться к кормушке, а чтобы что-то изменить в стране. Палата представителей по статусу своему ничего изменить не может, это образец политической импотенции".

Раней такое ж стаўленне ў Лябедзькі было і да мясцовых выбараў 1999 года: "К вопросу о региональных выборах. Таковых в 1999 году в Беларуси не предвидится. В апреле состоятся псевдовыборы, по итогам которых президентская "вертикаль" отберёт, а президент утвердит так называемых депутатов... все демократические партии заявили о своём неучастии в имитации выборов. Мы призываем ОБСЕ не посылать своих наблюдателей в апреле текущего года в Беларусь для участия в контроле за ходом мероприятий, именуемых выборами в местные Советы депутатов, дабы не легитимизировать их результаты" (з выступлення А. Лябедзькі на пасяджэнні Пастаяннага камітэта Парламенцкай Асамблеі АБСЕ у студзені 1999 года).

Урэшце дэмакратычныя сілы пры падтрымцы АБСЕ (Арганізацыя па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе) сфармулявалі наступныя ўмовы свайго ўдзелу ў выбарах і прызнання іх міжнароднай супольнасцю:

1. Спыненне пераследу людзей па палітычных матывах, вызваленне палітычных вязняў, высвятленне лёсу зніклых людзей, гарантыя свабоды шэсцяў і мітынгаў.

2. Ніхто, акрамя парламента, не можа прымаць законы, абавязковыя для выканання ўсімі, і ажыццяўляць кантроль за выкананнем дзяржаўнага бюджэту.

3. Палітычныя партыі і грамадскія рухі павінны мець гарантаваны бесцэнзурны доступ да дзяржаўных радыё і тэлебачання.

4. Выбарчыя камісіі павінны быць незалежнымі ад улады і складацца з прадстаўнікоў палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў.

Гэтыя патрабаванні беларускія ўлады праігнаравалі. Таму пераважная большасць апазіцыйных партый і арганізацый байкатавалі і мясцовыя выбары ў 1999 годзе, і выбары ў Палату прадстаўнікоў у 2000 годзе.

Але праз чатыры гады гэтыя ж самыя людзі ўдзельнічалі ў мясцовых выбарах 2 сакавіка 2003 года. Яны ж цяпер актыўна рыхтуюцца да восеньскіх выбараў у Палату прадстаўнікоў, аб'яднаўшыся ў кааліцыю "пяцёрка плюс".

Натуральна ўзнікае пытанне да "пяцёркі плюс": а што здарылася?

Улады выканалі гэтыя чатыры патрабаванні апазіцыі? Відавочна, што не. Сітуацыя яшчэ больш пагоршылася.

Прапалі (зніклі) прынцыпы? Але ніхто, прынамсі, публічна не прызнаўся ў сваёй беспрынцыповасці.

Памыліліся з байкотам? Таксама ніхто з партый і арганізацый, якія ініцыявалі байкот, не заявіў пра гэта, болей за тое, ніхто з іх лідэраў не падаў, хаця б сімвалічна, у адстаўку.

Апазіцыя прызнала легітымнасць і законнасць, паўнамоцнасць Палаты прадстаўнікоў? Таксама не. Дык як можна займацца выбарамі, пра якія загадзя гаворыцца, што яны несапраўдныя?

Адказаў на пастаўленыя вышэй пытанні няма.

